№96 (1659)
Пятніца, 30 мая 2003 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Кошт свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Народная Воля

E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — +20...+22, уначы — +10...+12; у Брэсце ўдзень — +22...+24, уначы — +11...+13; у Гродне ўдзень — +22...+24, уначы — +11...+12; у Віцебску ўдзень — +17...+19, уначы — +10...+12; у Гомелі ўдзень — +18...+20, уначы — +9...+11, у Магілёве ўдзень — +20...+22, уначы — +10...+12. Па ўсёй краіне захаваецца сонечнае надвор'е, без ападкаў.

www.meteo.by

Прэзідэнта Буша просяць падумаць пра Беларусь

Восем членаў Хельсінкскай камісіі ЗША накіравалі ліст амерыканскаму прэзідэнту Джорджу Бушу з заклікам абмеркаваць некаторыя пытанні правоў чалавека са сваімі еўрапейскімі калегамі падчас яго візіту ў Польшчу і Расію, які пачнецца 30 мая 2003 года.

У прыватнасці, члены камісіі заклікалі Дж.Буша абмеркаваць з расійскім прэзідэнтам Уладзімірам Пуціным "пазіцыю Расіі ў дачыненні да складанай сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, а таксама парушэнне правоў чалавека ў Чэчні".

"Мы глыбока занепакоены сітуацыяй з правамі чалавека, дэмакратыяй і вяршэнствам закона ў Беларусі, — гаворыцца ў лісце членаў Хельсінкскай камісіі. — Мы просім вас заклікаць Расію выкарыстаць свой уплыў для забеспячэння дэмакратычнага развіцця ў Беларусі, а таксама пацвердзіць падтрымку Злучанымі Штатамі незалежнасці і суверэннасці Беларусі".

Вольга ЛАПІКАВА, БелаПАН.

«Міжнародная амністыя» канстатуе атмасферу нецярпімасці ў Беларусі

Праваабарончая арганізацыя "Міжнародная амністыя" прадставіла ў Маскве даклад аб сітуацыі з правамі чалавека ў 151 краіне ў 2002 годзе.

У інтэрв'ю карэспандэнту БелаПАН Нікола Дакворт выказала занепакоенасць сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі. Парушэнні правоў чалавека ў краіне "выкліканы атмасферай нецярпімасці", лічыць Нікола Дакворт. Паводле яе слоў, адказнасць за такую сітуацыю нясуць беларускія ўлады — "аўтарытарны рэжым, што ўсталяваўся ў Беларусі".

Тым не менш у раздзеле "Добрыя навіны" справаздачы за 2002 год узгадваюцца "датэрміновае вызваленне вязня сумлення Андрэя Клімава" — вядомага беларускага апазіцыянера — і змякчэнне прысудаў у адносінах да гродзенскіх журналістаў Міколы Маркевіча і Паўла Мажэйкі.

Андрусь ЛАТЫШЭВІЧ.

У ліцэі імя Я.Коласа — хваляванні

28 мая намеснік міністра адукацыі Казімір Фарыно прадставіў педагагічнаму савету Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Я.Коласа яго новага кіраўніка Таццяну Шчарбацэвіч.

Гэтае прызначэнне выклікала адмоўную рэакцыю не толькі выкладчыкаў і бацькоў ліцэістаў, але і Управы беларускай інтэлігенцыі.

Нагадаем, што пяць гадоў таму ліцэісты і іх бацькі пры падтрымцы грамадскасці не дапусцілі высялення ліцэістаў з будынка, размешчанага па вуліцы Кірава, 21 у Мінску. Тады ж дырэктар навучальнай установы Уладзімір Колас пагадзіўся панізіць свой статус да намесніка дырэктара, каб выратаваць ліцэй. Увесь гэты час пасада дырэктара афіцыйна была вольнай, навучальнай установай фактычна кіраваў Уладзімір Колас, яму дапамагалі два намеснікі — Лявон Баршчэўскі і Ірына Сідарэнка.

Паводле слоў Коласа, калектыў ліцэя знаходзіцца ў стрэсавым стане ў адказны перыяд завяршэння навучальнага года і падрыхтоўкі да выпускных і ўступных экзаменаў. "Усё гэта "б'е" па наборы — многія бацькі і іх дзеці сумняваюцца наконт падачы дакументаў", — зазначыў У.Колас. Паводле яго меркавання, прызначэнне на пасаду дырэктара чалавека, які нічога не ведае аб ліцэі і недастаткова валодае беларускай мовай, з'яўляецца праявай непавагі да навучальнай установы. "У гэтай сітуацыі я вымушаны пакінуць яго, паколькі не магу несці адказнасць за змест навучальна-выхаваўчага працэсу", — заявіў У.Колас.

Як зазначыў мастак Аляксей Марачкін, у Міністэрстве адукацыі прызнаюць высокі ўзровень працы ліцэя. "У многім гэта звязана з асобай Уладзіміра Коласа, які сфарміраваў калектыў выкладчыкаў з вядомых прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі. Прызначэнне новага дырэктара вядзе да знішчэння гэтай элітарнай навучальнай установы", — лічыць А.Марачкін. Прызначэнне Т.Шчарбацэвіч на пасаду дырэктара ліцэя ён звязвае з актыўным удзелам У.Коласа ў грамадска-палітычным жыцці краіны, у тым ліку — у аргкамітэтах па скліканні Усебеларускага сходу інтэлігенцыі і стварэнні руху "За лепшае жыццё".

Марат ГАРАВЫ, БелаПАН.

Сто капсул з ртуццю знойдзена ля вёскі Сурканты

Капсулы дыяметрам адзін сантыметр і даўжынёй у паўтара сантыметра былі знойдзены мясцовымі жыхарамі 25 мая на палетках калгаса "Праўда", недалёка ад вёскі Сурканты. З пачатку тыдня капсулы распаўсюдзіліся па вёсцы, а 28 мая з'явіліся ў школе вёскі Пялясы. Адна з капсул разбілася, і ртуць разлілася па класе.

На месцы здарэння ратавальнікі сабралі каля двух грамаў ртуці, правялі дэмеркурызацыю 17 квадратных метраў памяшканняў, школы. Канфіскавана каля ста капсул з ртуццю. Зробленыя замеры паказалі, што ні ў школе, ні на адкрытым паветры перавышэння межава-дапушчальнай канцэнтрацыі ртуці не зарэгістравана. Ніхто з жыхароў вёскі і вучняў школы не пацярпеў, пагрозы для здароўя людзей і экалогіі няма.

Дзмітрый БЕЛЬСКІ.

ТЭМА ДНЯ

Прыдушылі!

Міністэрства інфармацыі прыпыніла на тры месяцы выхад выданняў "Белорусская деловая газета" і "БДГ. Для службовага карыстання".

Як паведаміў БелаПАН Пётр Марцаў, генеральны дырэктар выдавецкага прыватнага прадпрыемства "Марат", якое з'яўляецца заснавальнікам і выдаўцом газет, на мінулым тыдні "БДГ" і "БДГ. Для службовага карыстання" атрымалі тры папярэджанні з Міністэрства інфармацыі. Два з іх — па артыкуле 5 закона "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі" — атрымала сама "БДГ".

Наяўнасць у газеты двух папярэджанняў па гэтым артыкуле робіць магчымым прыпыненне выдання на тры месяцы альбо яго закрыццё рашэннем суда. Першае папярэджанне было вынесена за артыкул "Барский имидж", у якім міністэрства заўважыла распаўсюджанне звестак, якія ганьбяць гонар і годнасць прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Паводле слоў П.Марцава, артыкул з'яўляўся "бліц-апытаннем аб тым, ці мае права прэзідэнт карыстацца службовым самалётам у асабістых мэтах".

Другое папярэджанне было вынесена за публікацыю "Где леоновские миллионы?.. Прокуратура республики не может ответить на этот вопрос. Ищет", прысвечаную расследаванню справы былога дырэктара Мінскага трактарнага завода Міхаіла Лявонава. На думку Міністэрства інфармацыі, у артыкуле абнародаваны "незавершаныя вытворчасцю матэрыялы дазнання, папярэдняга следства і судовых спраў без пісьмовага дазволу".

Папярэджанне "БДГ. Для служебного пользования" было вынесена за публікацыю матэрыялаў, прысвечаных справе Віктара і Андрэя Казекаў.

П.Марцаў паведаміў БелаПАН, што загады Міністэрства інфармацыі будуць абскарджаны. "Мы будзем шукаць юрыдычны выхад з гэтай сітуацыі і пастараемся ў гэтым працэсе даказаць, што мы маем рацыю", — паведаміў ён.

> МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
>
> ЗАГАД
>
> 28 мая 2003г. Мінск № 96
>
> О приостановлении деятельности газеты «Белорусская деловая газета»
>
> На основании представлений Прокуратуры Республики Беларусь об устранении нарушений законодательства о печати и в связи с грубыми нарушениями редакцией газеты «Белорусская деловая газета» законодательства о печати, а именно:
>
> опубликование в газете «Белорусская деловая газета» (№57 от 18.04.2003г.) материала под заголовком «Барский имидж», который вопреки требованиям статей 5, 40 Закона Республики Беларусь «О печати и других средствах массовой информации» не только вводит в заблуждение граждан Беларуси, но и порочит честь и достоинство Президента Республики Беларусь;
>
> опубликование в газете «Белорусская деловая газета» (№62 от 29.04.2003г) статьи «Где «леоновские миллионы»? Прокуратура республики не может ответить на этот вопрос. Ищет...», в которой вопреки требованиям статьи 5 Закона о печати опубликованы материалы уголовного дела без письменного разрешения судьи,
>
> **ПРИКАЗЫВАЮ:**
>
> Приостановить в соответствии со статьей 16 Закона Республики Беларусь «О печати и других средствах массовой информации» деятельность газеты «Белорусская деловая газета» сроком на три месяца.
>
> Министр [подпіс] М.В. Подгайный

> МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
>
> ЗАГАД
>
> 28 мая 2003г. Мінск № 97
>
> О приостановлении деятельности газеты «БДГ. Для служебного пользования»
>
> На основании представлений Прокуратуры Республики Беларусь об устранении нарушений законодательства о печати и в связи с грубыми нарушениями редакцией газеты «БДГ. Для служебного пользования» законодательства о печати, а именно:
>
> опубликование в газете «БДГ. Для служебного пользования» (№4 (15) за апрель 2003 г.) статьи под заголовком «Система жертв не считает. Опала довела бывшего министра до самоубийства», в которой вопреки требованиям статей 32 и 40 Закона Республики Беларусь «О печати и других средствах массовой информации» распространяются недостоверные сведения и вводятся в заблуждение граждане Беларуси;
>
> опубликование в газете «БДГ. Для служебного пользования» (№3 (14) за март 2003 г.) статьи «Магический кристалл», в которой вопреки требованиям статей 32 и 40 указанного Закона также распространяются недостоверные сведения,
>
> **ПРИКАЗЫВАЮ:**
>
> Приостановить в соответствии со статьей 16 Закона Республики Беларусь «О печати и других средствах массовой информации» деятельность газеты «БДГ. Для служебного пользования» сроком на три месяца.
>
> Министр [подпіс] М.В. Подгайный

У сувязі з прыпыненнем выхаду "Белорусской деловой газеты" і "БДГ. Для службовага карыстання" Рада грамадскага аб'яднання "Беларускі ПЭН-цэнтр" прыняла тэрміновую заяву, у якой адзначыла, што гэта — "чарговы крок па задушэнні свабоды слова ў Беларусі".

"Выклікае глыбокую трывогу мэтанакіраванасць дзеянняў уладаў па абмежаванні доступу да аб'ектыўнай інфармацыі, якая выявілася таксама ў папярэджаннях газетам "Народная воля", у пераследзе газет "Навінкі", "Вечерний Столин", "Новая газета Сморгони". Выказваем словы падтрымкі журналістам і выдаўцам пераследаваных газет", — гаворыцца ў дакуменце "ПЭН-цэнтра".

БелаПАН.

***

P.S. *Учора адбылася прэс-канферэнцыя генеральнага дырэктара выдавецкага прадпрыемства "Марат" П.Марцава і галоўнага рэдактара "БДГ" і "БДГ. Для службовага карыстання" С. Калінкінай. Яны заявілі, што падрыхтаваны іскі ў суд аб прызнанні несапраўднымі папярэджанняў Міністэрства інфармацыі.*

***

Лілія АНАНІЧ, намеснік міністра інфармацыі:

«Мы працуем у межах заканадаўства»

— Закон аб сродках масавай інфармацыі трэба выконваць. Гэта аднназначна. 28 мая міністр інфармацыі падпісаў загад аб прыпыненні дзейнасці выданняў "Белорусская деловая газета" і "БДГ. Для службовага карыстання". У гэтых загадах выказаны дастаткова важкія прычыны, якія далі магчымасць разглядаць менавіта ў такой жорсткай плоскасці адносіны міністэрства да дзейнасці гэтых выданняў. Прыпыненне ў адпаведнасці з артыкулам 16 "Закона аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі" дзейнасці "БДГ" і "БДГ. Для службовага карыстання" мае сур'ёзныя падставы.

— Што будзе азначаць на практыцы рашэнне міністэрства для газет?

— Само прыпыненне дзейнасці газет — гэта ўжо ёсць санкцыя. Што за гэтым хаваецца? За гэтым павінна стаяць няўхільнае выкананне заканадаўства рэдакцыяй, калі яна з'яўляецца законапаслухмянай.

Леанід МАЛАХАЎ, прадпрымальнік, сустаршыня грамадскага аб'яднання "Прыватная ўласнасць":

«Я разглядаю такі крок уладаў як чарговы наступ на свабоду слова»

— Спачатку яны ўзяліся за мясцовыя незалежныя выданні, зараз —- за рэспубліканскія. Як чалавек, які цікавіцца дзелавой інфармацыяй і пастаянны чытач "БДГ", лічу, што газета вельмі патрэбная грамадству, у ёй пастаянна падымаюцца вострыя праблемы. На мой погляд, гэта і не спадабалася людзям ад улады.

— Ці прымусіць прыпыненне дзейнасці "БДГ" прадпрымальнікаў шукаць іншыя крыніцы інфармацыі, напрыклад, чытаць дзяржаўныя газеты?

— Я думаю, адно з другім не звязана. Проста трэба будзе больш выпускаць інфармацыйных улётак з вострымі матэрыяламі.

Міхаіл ЧЫГІР, прэм'ер-міністр Беларусі ў 1994—1996 гг.:

«Ногі растуць з Адміністрацыі прэзідэнта»

— Я лічу, што ў выпадку з прыпыненнем дзейнасці "БДГ" ногі растуць з Адміністрацыі прэзідэнта. Я ведаю, што там ёсць дзве групоўкі — адна падтрымлівае ідэю жорсткага прэсінгавання незалежных газет, другая, якая разумее, што ад гэтага будзе толькі горш, — супраць.

Я лічу, што недзяржаўныя газеты распаўсюджваюць аб'ектыўную інфармацыю пра жыццё ў Беларусі. Гэта і не падабаецца цяперашнім уладам. А фармальную прычыну для закрыцця заўсёды можна знайсці. У дадзеным выпадку я не бачу важкіх прычын для прыпынення дзейнасці газеты.

— Як Вы лічыце, Міхаіл Мікалаевіч, ці выйграе грамадства, калі знікне "Белорусская деловая газета"?

— Канешне, не выйграе. Ніхто не выйграе — ні грамадства, ні ўлады.

Валерый ФРАЛОЎ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў:

«Я не здзіўлены такім крокам уладаў»

— Ідзе мэтанакіраваны працэс наступу на свабоду слова. І выпадак з "БДГ" для мяне, шчыра кажучы, сюрпрызам не з'явіўся. Гэта вельмі непрыемна. Грамадства толькі страціць, калі знікне яшчэ адна незалежная газета. Я ведаю шмат людзей, якія рэгулярна чытаюць "Белорусскую деловую газету", паколькі яна асвятляе актуальныя праблемы. Калі гэтыя праблемы, гэтыя беды будуць замоўчвацца, ад гэтага нічога добрага не будзе.

Гутарыў Алесь СІЛІЧ.

СМЕХОТУРА

Владимир Даль против Александра Лукашенко

Зря вот клеветали некоторые, что глава Беларуси — против приватизации и все такое. Скоро в этом плане будет сделан самый радикальный в истории шаг. В нашем царстве-государстве де-факто приватизируют само слово "президент".

Александр КЛАСКОВСКИЙ

До последнего времени оставалось слабое предположение, что мы имеем дело с излишним рвением подчиненных. Ну бывает, решили угодить шефу, да перестарались. Это я о недавнем постановлении Совмина, которое, по сути, предписало всем начальникам страны, носящим не по Сеньке шапку, то есть не по рангу почетный титул, выбрать взамен что-либо поскромнее — типа председателя, директора и т.п. Говоря официальным слогом, слово "президент" исключается из перечня названий руководителей организаций.

Но оказалось, что никаким подхалимажем здесь не пахнет. О причинах новации прямо сказала заведующая управлением Минюста Анна Шпак. Она раскрыла карты корреспонденту "Интерфакса": *"Идея о том, что именоваться президентом сможет только глава государства, принадлежит белорусскому президенту Александру Лукашенко, который дал соответствующее поручение своей Администрации".*

Теперь в чиновной тиши готовятся нормативно-правовые поправки, в соответствии с которыми именоваться президентом в Беларуси сможет только один человек. А без пяти минут разжалованные президенты разных калибров уже подсчитывают грядущие траты времени, нервов и денег. Ну ладно там табличку на двери поменять — это дело плевое. Так ведь надо же еще и переписывать уставы организаций, а потом, по логике вещей, заново их регистрировать! Любая же регистрация у нас, как известно, легко превращается в инквизицию. И потом, все эти дела предстоит оплачивать. Выходит, отобрали звание — и за это же еще требуют раскошелиться.

Впрочем, многие восприняли пертурбацию философски. По принципу "хоть горшком назови, только в печь не сажай". Только ведь и посадить могут. У нас же новый виток борьбы с коррупцией. Может, тут и собака зарыта. Некрасиво как-то читать в газетах: бывший президент на скамье подсудимых... Неприятно! Сразу мысли про Милошевича навевает.

Чиновники, конечно, пилюлю съедят. Станет, например, Михаил Мясникович председателем Академии наук. Корона-то не свалится. А главное, в академии люди ученые. Они ему словарь Даля раскроют и утешат. Дело в том, что "президент" — это тот же "председатель", только по-латыни. У Даля так и идет — через запятую: "ПРЕЗИДЕНТ, -*ша*, лат. председатель, -*ша*, старший член совещательного места, управления".

Очень обидное объяснение, надо заметить. За что тогда, спрашивается, боролись, если в итоге один черт? И какой еще такой "старший член"? А самое главное, никакой Минюст старину Даля уже не перепишет. И не накажет. Помните, как в старой кинокомедии: "Деревня, кто ж его посадит? Он же памятник!".

Менінгіт перабраўся ў Гродзенскі раён

Замоўчваецца пагроза пашырэння захворвання

Згодна з афіцыйнымі данымі, колькасць людзей шпіталізаваных з падазрэннем на менінгіт, перавысіла лічбу 180. Нягледзячы на заявы гродзенскіх чыноўнікаў аб тым, што хвароба пайшла на спад і "ўсё пад кантролем", колькасць захворванняў працягвае павялічвацца. Некалькі выпадкаў хваробы ўжо зафіксаваны на тэрыторыі Гродзенскага раёна. Нельга выключыць, што ачагі захворвання могуць цяпер знаходзіцца на тэрыторыі ўсёй Гродзенскай вобласці.

Дакладна вядома, што выпадкі захворвання на серозны менінгіт зарэгістраваны ў вёсках Адэльск, Азеры, Квасоўка і Калбасіно. Інфармацыю аб гэтым "Народнай волі" пацвердзілі ў Гродзенскім абласным цэнтры гігіены і эпідэміялогіі, засцерагаючы, што канчатковы дыягназ яшчэ не пастаўлены. Не выключана, што гэта толькі верхавіна айсберга. Урачы дастаткова нервова рэагуюць на пытанні пра пашырэнне геаграфіі захворвання. "Я лячу хворых, а не правяраю іх месца жыхарства", — заявіў Станіслаў Ількевіч, галоўны ўрач Гродзенскай абласной інфекцыйнай бальніцы.

Гродзенскія эпідэміёлагі тлумачаць прычыну пашырэння тэрыторыі, дзе зафіксаваны выпадкі захворвання, наступным чынам. "Інкубацыйны перыяд хваробы складае да 10 дзён, і дзеці, якія раз'ехаліся на канікулы, цяпер звяртаюцца да ўрачоў па месцы свайго знаходжання", — лічыць Аляксандр Руфкін, намеснік галоўнага ўрача абласнога Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі. Але гэта не цалкам адпавядае рэчаіснасці. Напрыклад, у Азерах, Адэльску і Квасоўцы захварэлі мясцовыя жыхары. "Хворы наведаў Гродна, дзе ў яго сваякі. Пасля вяртання выявілася хвароба, і ён быў шпіталізаваны", — гаворыць Таццяна Ціткова, педыятр Азерскай бальніцы.

Варта адзначыць, што ў Адэльску і Квасоўцы хворыя не наведвалі Гродна, значыць, першакрыніца хваробы так і засталася нявысветленай. Паколькі серозны менінгіт распаўсюджваецца кантактна-бытавым і паветрана-кропельным шляхамі, не выключана, што колькасць хворых па-за межамі Гродна цяпер будзе павялічвацца. На тэрыторыі Гродзенскага раёна распачаліся супрацьэпідэміялагічныя мерапрыемствы.

Гродзенская абласная інфекцыйная бальніца не ў стане прыняць усіх хворых, таму спецыяльныя палаты для хворых на менінгіт выдзелены ў іншых бальніцах горада. Па Гродне ходзяць чуткі, што ўжо ёсць смяротныя выпадкі. "Афіцыйна вам заяўляю, што ніхто не памёр. Хвароба працякае ў лёгкай і сярэдняй формах. Няма ніякіх складанасцяў, мы ўжо выпісалі 34 асобы", — гаворыць Станіслаў Ількевіч.

"Я не веру афіцыйным паведамленням, чыноўнікі проста прыкрываюць сябе", — лічыць Анатоль Хацько, бацька адной з хворых дзяўчынак. Ён звярнуўся ў пракуратуру Ленінскага раёна з патрабаваннем узбудзіць крымінальную справу па факце масавых захворванняў у Гродне.

Андрэй АДЛЯНІЦКІ.

На здымку: *сваякі размаўляюць праз акно з хворымі на менінгіт.*

Фота IREX/ProMedia.

«Народная воля» была, ёсць і будзе!

Наша сіла — у сяброўстве з вамі, шаноўныя чытачы. Не забудзьце падпісацца на другую палову 2003 года!

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з вамі!

РЭХА

Стадыён на касцях

Пракуратура Ленінскага раёна г.Гродна завяршыла праверку па скарзе старшыні яўрэйскай абшчыны Міхаіла Каржа. Парушэнняў права ў дзеяннях гродзенскіх уладаў праверка не знайшла.

Нагадаем, што старшыня яўрэйскай абшчыны звярнуўся ў пракуратуру з патрабаваннем правесці праверку законнасці будаўнічых работ, якія праводзяцца на стадыёне "Нёман", дзе да 1961 года знаходзіліся яўрэйскія могілкі. У лютым-сакавіку гэтага года разам з зямлёй са стадыёна былі вывезены чалавечыя косці і высыпаны ў сметнікі каля вуліц Чарнышэўскага і Новай. Падрабязна аб сітуацыі мы ўжо пісалі ("Народная воля" № 65, артыкул "Хакей на касцях"). Менавіта пасля публікацыі гэтага артыкула Міхаіл Корж вырашыў звярнуцца ў абласную пракуратуру. Там, відаць, палічылі справу не надта важнай, таму што перадалі яе на разгляд пракуратуры Ленінскага раёна.

Праверку па скарзе старшыні яўрэйскай абшчыны праводзіў намеснік пракурора Аляксандр Абрамовіч. Ён фактычна пацвердзіў тую інфармацыю, якую раней распаўсюдзіла прэс-служба Гродзенскага гарвыканкама. Так, згодна з данымі праверкі, "невялікая колькасць касцей" апынулася на вуліцы Новай і Чарнышэўскага "выпадкова, разам з мерзлай глебай". А таму вінаватых няма. Будаўнічыя работы на стадыёне "Нёман" працягваюцца, але цяпер рабочыя збіраюць косці ў спецыяльныя кантэйнеры. Іх канчатковы лёс пакуль што не вызначаны.

"Пракуратура палічыла, што было знойдзена паразуменне паміж намі і ўладамі. У нас была сустрэча з губернатарам Саўчанкам, цяпер сітуацыя знаходзіцца пад кантролем", — лічыць Міхаіл Корж.

Разам з тым прыбіраць косці, якія засталіся на вуліцах Новай і Чарнышэўскага, цяпер, напэўна, ніхто не будзе.

Андрэй АДЛЯНІЦКІ.

Пружина Немиги

Каждый минчанин в майские дни вспомнил о трагедии в подземном переходе 30 мая 1999 года

Это страшное событие потрясает своей нелепостью. Не было никакой аварии, ничто не обрушилось и не взорвалось. Все произошло в самой обычной городской обстановке. Был скоротечный летний ливень, каких в это время бывает немало. Было скопление людей, молодежи: этим тоже горожан не удивишь. Все сложилось вдруг, в одно мгновение. Роковое стечение обстоятельств. Такой расхожей фразой частенько пытаются все объяснить. Как-то не воспринимается эта фраза. Не снимает она простого вопроса: почему?

Хочется найти ту внутреннюю пружину, завод которой сработал в тот роковой час. Милиция или городские власти виноваты? Наверное, в какой-то части это так. Эти люди должны были предвидеть опасность ситуации. Они должны по роду службы обладать знаниями, позволяющими предвидеть поведение толпы.

Думается, а если бы эти знания или какой-то минимум этих знаний, доступных для рядовых обывателей, был известен людям, образующим толпу. Могло бы что-либо измениться? Может быть, тогда толпа с пониманием относилась бы к действиям милиции при проведении массовых мероприятий? Не возмущались бы люди перекрытыми улицами, легче выполняли указания стражей порядка. Ведь понимают наши люди многие вещи и из химии, и из физики, и из математики, и даже поражающие факторы ядерного взрыва — для всех понятная вещь.

Наша система образования почему-то не особенно предрасположена к тому, чтобы дать людям некоторые знания из тех которыми сегодня вооружены органы правопорядка, чтобы городские жители получили необходимые для жизни в городе знания и навыки поведния, позволяющие избегать узких мест этой жизни как в прямом, так и в переносном смыслах.

Как же это было? Давайте попытаемся представить. Праздник, пиво, жара, смех, туча, дождь. Девчонки, будучи более благоразумными, заметили нависшую черную тучу пораньше, чем те, кто в это время был увлечен пивом. Стали подтягиваться, цокая каблучками, к единственному укрытию в окрестностях, к подземному переходу. Дождь хлынул быстро и обильно. Девчонки рванули в переход. На каблучках бегать не ахти как удобно, но переход уже рядом. Забежали под крышу перехода и остановились. Дождь уже не достает. Можно отдышаться. Зачем идти дальше? Дождь, судя по всему, должен закончиться в считанные минуты. Хочется посмотреть на то, что делается на улице. Трудно сейчас сказать, успели ли они даже оглянуться. Этого уже некому рассказать. Сверху по лестнице волной покатились добежавшие любители пива. Трудно устоять на каблучках...

Автору этих строк довелось присутствовать несколько лет тому назад при похожей ситуации в подземном переходе на вокзале. Лето. Хлынул скоротечный ливень. К перрону вокзала подошла электричка с дачниками. Народ с собранным урожаем устремился в переход. Находясь в середине перехода, жутковато было наблюдать, помня произошедшее на Немиге, как у выходов собралась толпа людей. Народ стоял стеной. Все, как один, смотрели наружу, на бушующий ливень.

Буквально в течение нескольких минут толпа в переходе со стороны вокзала превратилась в непроходимую. Люди, обремененные дачной поклажей, превратили вход в переход в самую настоящую баррикаду. До беды не хватило только одного: молодой энергии. У тех, кто протискивался сквозь баррикаду в переход не было сил после дачного труда, чтобы делать это поэнергичней и чтобы ускорение превратило их массу в убойную силу. Середина подземного перехода на всем своем протяжении в тот момент была абсолютно пуста.

Ничто и никто не мешал людям из баррикады сделать десятка три шагов, что бы пережидать дождь спокойно, не мешая другим людям и не подвергая себя опасности быть раздавленным. Не было здесь в этот момент и милиции, которая одна в этом городе, как мы уже выяснили, знает секреты поведения толпы.

Если немного понаблюдать за поведением наших сограждан, то становится понятным, где спрятана та самая пружина, о которой мы уже говорили вначале, которая при определенных обстоятельствах может опять привести к трагедии. В повседневности такое поведение доставляет только неудобства и огорчения. Например, стоит посмотреть, как пассажиры в час пик осаждают электропоезда. Обычно, не желая себя утруждать лишними движениями, народ останавливается в тамбуре вагона или же сразу за дверью. Чаще там располагается молодежь, которая никогда не была знакома с краткой инструкцией советского периода: не стой на проходе.

Если с улицы посмотреть через окна в вагон готовящейся к отправки электрички, то становится как-то неловко за присутствующих. В тамбур уже невозможно ни войти, ни залезть, а в середине вагона хоть танцы танцуй. Очень часто, особенно на промежуточных станциях, например, в Масюковщине или Лебяжьем, на перроне возмущенно жестикулируют несостоявшиеся пассажиры по поводу очевидной несправедливости — вагоны не заполнены, а попасть в них невозможно.

Примерно то же можно видеть ежедневно и в городском транспорте. Доходит до абсурда. Есть граждане, которым почему-то нравится ездить в троллейбусе или автобусе, исключительно стоя в дверях. В Минске даже вошло в традицию, в правило хорошего тона: всегда спрашивать у тех, кто стоит в дверях, выходят они или нет. Если поразмыслить, то должно быть наоборот. Автомобилисты знают, что на перекрестке при включении зеленого сигнала светофора все автомобили обязаны трогаться с места, хотят того их водители или нет. Пассажирам общественного транспорта такое простое и логичное правило почему-то не известно. Стоящий в дверях даже считает своим долгом повозмущаться, если у него загодя не спросят разрешения выйти.

Так о чем все-таки речь? Чукчу с детства учат, жить и выживать на морозе, учат как разжечь огонь, как защититься от пронизывающего ветра, как поймать оленя. Аборигена Австралии — как жить и выживать в нестерпимую жару в бескрайней пустыне. В наши времена и тех и других загружают и физикой, и химией-математикой, но вряд ли забудут про простые житейские истины. Наверное, мы не успели еще осознать в нужной степени, что мы живем в период бурной урбанизации. Города разрастаются. Потоки жителей и машин утюжат улицы. Жизнь сама диктует, что нужно менять какие-то свои житейские привычки, приобретать новые.

Александр ЕМЕЛИН.

Живые и бронзовые цветы на месте трагедии.

Фото IREX/ProMedia.

ПУЛЬС

На будаўніцтве Мінскага метрапалітэна

На будаўніцтве другой лініі Мінскага метрапалітэна на ўчастку паміж станцыямі "Ракаўская" і "Кунцаўшчына" працягласцю каля 300 метраў будаўнікі ўпершыню сутыкнуліся з вялікімі залежамі торфу таўшчынёй амаль 9 метраў. Паколькі торф не можа вытрымаць канструкцыю будоўлі, на гэтым участку ўстанаўліваюцца спецыяльныя жалезабетонныя сваі, а будаўніцтва тунеляў вядзецца адкрытым спосабам, каб замяніць тарфяныя грунты на пясчаныя, якія змогуць вытрымаць нагрузкі.

Зараз на ўчастку працягласцю 3,8 кіламетра вядзецца ўстаноўка рэек і шпал, а таксама мантаж платформенных участкаў. На ўсіх трох станцыях — "Ракаўская", "Кунцаўшчына" і "Каменная горка" — амаль гатовыя вестыбюлі.

У аздабленні станцый будуць прымяняцца толькі натуральныя даўгавечныя матэрыялы мармур і граніт, што пастаўляюцца з Расіі, Украіны, Іспаніі, Грэцыі і Партугаліі.

Зараз паскоранымі тэмпамі вядзецца праектаванне чацвёртага ўчастка першай лініі метрапалітэна ад станцыі "Інстытут культуры" да станцыі "Пятроўшчына", які будзе звязваць мікрараёны "Паўднёвы Захад" і "Малінаўка" з усімі раёнамі горада. Да канца года плануецца зацвердзіць ва ўрадзе архітэктурны праект участка, каб ужо сёлета пачаць падрыхтоўчыя работы, у 2004-м — асноўныя работы, а да 2010 года — цалкам завяршыць будаўніцтва першай лініі метро.

Да 2030 года плануецца пабудаваць трэцюю лінію з канцавымі станцыямі ў раёне плошчы Бангалор і мікраёне "Серабранка". Яна пройдзе па вуліцы Багдановіча, перасячэ другую лінію на станцыі "Фрунзенская" і першую лінію — на станцыі "Плошча Незалежнасці".

Лавінія АРЭШКА.

Вайна ваўкам!

Кіраўніцтва Гомельскай вобласці прыняло рашэнне стварыць у пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС раёнах мабільныя брыгады спецыялістаў-ваўкароў, якія здольныя адшукаць і знішчыць патомства драпежніка ў яго логаве.

На такі непапулярны ў абаронцаў жывой прыроды крок прымусіў пайсці рост пагалоўя ваўкоў у рэгіёне, які практычна выйшаў з-пад кантролю. З-за распаўсюджвання сярод звяроў шаленства ўзнікла рэальная пагроза жыццю і здароўю людзей.

Паводле звестак эколагаў, сёння колькасць ваўкоў у Палескім дзяржаўным радыяцыйна-экалагічным запаведніку і прылеглых да яго раёнах перавышае 400 галоў пры аптымальнай іх колькасці ў 50—60 жывёл. Прычым большая частка зграі — ваўчыхі, здольныя прыносіць штогод па 5—7 шчанюкоў. Калі сітуацыю не ўзяць пад кантроль, дык у найбліжэйшыя паўгода пагалоўе драпежнікаў перавысіць норму ў 10 і больш разоў.

Наталля ВАСІЛЕВІЧ.

Беспрацоўным няма куды падзецца

Ва ўмовах нястрымнага росту беспрацоўя стварэнне новых рабочых месцаў з'яўляецца ў асноўным не дзяржаўнай, а прыватнай справай.

У Віцебску, да прыкладу, за мінулы год пры наяўнасці 11 тысяч беспрацоўных было створана каля 4 тысяч рабочых месцаў, з якіх толькі 344 — на прадпрыемствах дзяржаўнага сектара эканомікі. 892 месцы адкрыліся на прыватных прадпрыемствах, а яшчэ 2967 чалавек зарэгістраваліся ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, што азначае адсутнасць стабільнага і дастатковага заробку.

Шэрагі беспрацоўных папаўняюцца за кошт скарачэння штатаў на прадпрыемствах, вызваленых з месцаў пазбаўлення волі, выпускнікоў ВНУ, тэхнікумаў, ПТВ і школ.

З пачатку бягучага года ў Віцебску зарэгістравана 4613 беспрацоўных — на 431 больш, чым за першыя 4 месяцы мінулага года. Узровень беспрацоўя ў абласным цэнтры складае 4,12% ад працаздольнага насельніцтва.

Усяго на ўліку цяпер знаходзіцца 9102 чалавекі, а да канца года гэтая лічба ўзрасце, згодна з прагнозам службы занятасці, да 13000 чалавек, бо за гэты час з прадпрыемстваў горада будзе звольнена 3800 чалавек. Найбольш масавае звальненне адбываецца на заводзе радыёдэталяў і ў аб'яднанні "Віцязь".

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Чарнобыль.by

Адкрыўся сайт, у якім будзе не толькі ўсё аб чарнобыльскай трагедыі, але і інфармацыя для жыхароў забруджаных раёнаў, як гатаваць ежу, перапрацоўваць яе і захоўваць, каб пазбегнуць большага атручэння арганізма радыенуклідамі.

Сайт разлічаны ў асноўным на моладзь, якая мала што ведае пра катастрофу і з якой звязаны ўсе надзеі на вырашэнне вынікаў трагедыі.

Дарэчы, названаму сайту ўжо шэсць год. Але да нядаўняга часу ён быў не вельмі ўдалы. Стваральнікі аб'явілі тэндэр, які выйграла фірма "Атлант-тэлеком", яна поўнасцю і абнавіла сайт.

Адрас сайта: **http://www.chernobyl.by/.**

Павел АРЦЮШКЕВІЧ.

Збор нацыянальнай каманды па футболе

2 чэрвеня ў спарткомплексе "Стайкі", што пад Мінскам, пачнецца вучэбна-трэніровачны збор нацыянальнай каманды Беларусі па футболе напярэдадні чарговых адборачных матчаў чэмпіянату Еўропы 2004 года. 7 чэрвеня беларусы будуць прымаць у Мінску зборную Галандыі, а 11 чэрвеня сустрэнуцца ў гасцях з камандай Аўстрыі.

Трэнерскі штаб каманды на чале з Эдуардам Малафеевым плануе выклікаць на збор наступных футбалістаў:

варатары — Генадзь Туміловіч ("Антверпен", Бельгія), Васіль Хамутоўскі ("Металіст", Харкаў, Украіна), Юрый Цыгалка ("Дынама", Мінск);

абаронцы — Андрэй Астроўскі ("Арсенал", Кіеў, Украіна), Аляксандр Храпкоўскі ("Сокал", Саратаў, Расія), Аляксандр Лухвіч ("Тарпеда", Масква, Расія), Сяргей Амельянчук ("Арсенал", Кіеў, Украіна), Сяргей Штанюк ("Сток-Сіці", Сток-он-Трэнт, Англія), Уладзімір Шунейка ("Леўскі", Сафія, Балгарыя), Андрэй Лаўрык ("Дынама", Санкт-Пецярбург, Расія);

паўабаронцы — Сяргей Гурэнка ("П'ячэнца", Італія), Андрэй Мілеўскі ("Дынама", Мінск), Аляксандр Кульчый ("Шыннік", Яраслаўль, Расія), Дзяніс Коўба ("Крылы Саветаў", Самара, Расія), Максім Рамашчанка ("Газіантэпспор", Турцыя), Аляксандр Глеб ("Штутгарт", Германія), Валянцін Бялькевіч, Аляксандр Хацкевіч (абодва — "Дынама", Кіеў, Украіна);

нападаючыя — Віталь Кутузаў ("Спортынг", Лісабон, Партугалія), Максім Цыгалка ("Дынама", Мінск), Раман Васілюк ("Спартак", Масква, Расія).

Акрамя таго, да падрыхтоўкі могуць быць падключаны паўабаронцы Віталь Валодзенкаў, Сяргей Кавальчук (абодва — "Дынама", Мінск), Ігар Чумачэнка і Дзмітрый Ліхтаровіч (абодва — БАТЭ, Барысаў).

Пасля чатырох гульняў зборная Беларусі займае чацвёртае месца ў трэцяй адборачнай групе, набраўшы тры ачкі. Падапечныя Э.Малафеева прайгралі зборным Галандыі (0:3), Аўстрыі (0:2) і Чэхіі (0:2) і перамаглі футбалістаў Малдовы (2:1).

Дзмітрый УЛАСАЎ.

Шкада цётку Аньку

Гады з чатыры таму ў велікодную ноч згарэла хата маёй вясковай суседкі. Не маладая ўжо бабулька, сыны няпутныя, грошай зарабіць няма каму і няма дзе, за электрычнасць плаціць няма чым, вось і абрэзалі, як кажуць, правады. Прыйшлося рабіць саматробныя ацяпляльнікі — ад іх хатка і згарэла.

Спачатку гаспадыня нешта памкнулася зрабіць з дапамогай зяця, які жыве ў райцэнтры. Але ці ў таго сродкаў не хапіла, ці павагі да цешчы, але справа скончылася на нулявым цыкле. Таму цётка Анька прыстасавала пад жытло лазню, якую дзеліць з двума дарослымі непрацуючымі сынамі. Старэйшы, праўда, год дваццаць адпрацаваў конюхам у калгасе "Ленінскі шлях", які не так даўно быў прададзены нямецкаму прадпрымальніку спадару Штотцу. Але новы гаспадар калгаса (зараз аграфірма "Штотц—Агра") — чалавек рацыянальны, таму купляць вёску Падыгрушша (былую брыгаду №4) не схацеў. Нявыгадна. Але ж былыя калгаснікі, працай якіх будавалася гаспадарка, не атрымалі ад яе фактычнай прыватызацыі ані рубля, ані еўра. Хоць і абяцалі такую кампенсацыю выплаціць.

Таму многія з былых калгаснікаў выказваюць незадавальненне: дзесяткі год трубілі на гэты "Ленінскі шлях", а што атрымалі? Пытанне неадназначнае. Калгас, аб чым сведчыць практыка, загнуўся б і сам па сабе. А немец зрабіў тое, што некалі абяцаў Лукашэнка: запусціў-такі вытворчасць больш жыццяздольнай часткі гаспадаркі, збярог рабочыя месцы ды стварае новыя. Прычым заробкі добрыя, дысцыпліна нязвыкла жорсткая. Даярак на дойку возяць на джыпе, зарабляюць яны столькі, што з цягам часу могуць сабе нават патрыманы "Фольксваген" купіць. Калі гэта было такое?

Зразумела, што спадару Штотцу, які ставіць перад сабой мэту стварыць не толькі прыбытковую, але і ўзорную ў несавецкім сэнсе гаспадарку, патрэбны адпаведныя кадры. І сярод тутэйшага люду такіх няшмат. Многія з іх яшчэ дастаткова маладыя, што ўступалі ў жыццё падчас пабудовы "рынкавага сацыялізму", ніколі нідзе стала не працавалі. Што такое рэгулярная занятасць, калі на працу цвярозым трэба ісці нават у Велікодны дзень, яны не разумеюць. А іншых працадаўцаў няшмат. Таму прыкладна 90 працэнтаў мужчын працаздольнага ўзросту ў Падыгрушшы сталага занятку не маюць. Перабіваюцца з хлеба на капусту: таму дроў нарэжуць, таму граду ўскапаюць, у таго скрадуць "закаткі" са склепа.

Ці трэба гаварыць, што дзяцей у Падыгрушшы няшмат, а з тых, што ёсць, з вядомых прычын, нямала разумова адсталых?

Карацей, Падыгрушша вымірае, што выглядае лагічным вынікам шматгадовага руху па "ленінскім шляху". Дарэчы, нейкая фірма выкупіла гаспадарчыя пабудовы ў Падыгрушшы і плануе зрабіць тут майстэрню па вырабе трун ды іншых рытуальных атрыбутаў. Вельмі слушны выбар, бо, як сведчыць статыстыка, вясковае насельніцтва Беларусі скарачаецца ў 20 з лішнім разоў хутчэй, чым гарадское. А колькасць патэнцыйных кліентаў сягае да 3 мільёнаў. Так што збыт гарантаваны.

Вёска вымірае, але ж няма ў тым віны спадара Штотца. Бо не абавязаны ён будаваць хату цётцы Аньцы. А хто абавязаны перасяліць яе з лазні ў больш-менш прыстойнае жытло? Не патрэбна яна нікому, хай дажывае...

Падкрэслім, што спадар Штотц, што любы іншы інвестар, які будуе новую гаспадарку за ўласны кошт, адказнасці за беспрацоўе, за нялюдскія ўмовы жыцця, за п'янства тутэйшага люду ніякай не нясе. Гэта камуністы, якім для іх мэтаў спатрэбіўся "новы чалавек", такую пароду вывелі. А новыя ўлады стварылі ўмовы, пры якіх нават фізічна і маральна здаровыя людзі не маюць шанцаў наладзіць нармальнае чалавечае жыццё. Можна сцвярджаць, што палітыка генацыду ўласнага народа не толькі не скончылася, а нават набірае моц. Бо як інакш вызначыць прапанову аграрнага лобі, якую не так даўно ў сваім "аналітычным" артыкуле выказаў старшыня Белаграпрамсаюза Аляксей Скакун. Па-першае, ён адмаўляе сялянам у іх праве мець зямлю ў прыватнай уласнасці, гэта значыць у праве самім ратавацца ад галечы, паколькі дзяржава практычна збанкруцілася і чакаць ад яе чагосьці добрага няма часу. Бо жыццё, асабліва дрэннае, не доўжыцца.

А па-другое, і гэта, бадай, галоўнае, таварыш Скакун прапануе ўсе невялікія дзяржрэсурсы аддаць тром сотням "перадавых" гаспадарак, якія забяспечаць усе харчовыя патрэбы краіны. А астатнім, колькасць якіх сягае за дзве тысячы, за якімі сотні тысяч людзей, большасць вясковага насельніцтва, што? Зноў жа дуля з макам. Бо пакуль Скакун ды іншыя таварышы будуць падымаць вытворчасць на падставе ўкаранення новых тэхналогій, народ проста перамрэ. І каму тады спатрэбяцца горы мяса ды рэкі малака? Толькі самім "скакунам", каб апошні раз добра пад'есці ды потым утапіцца?

Усё-такі трэба думаць. Перад тым як нешта гаварыць. Бо вёска — гэта не толькі свінні, але яшчэ і людзі, якіх шкада, якія б яны ні былі.

Канстанцін СКУРАТОВІЧ.

НЕ МОГУ МОЛЧАТЬ!

Господа чиновники от образования, умерьте свои аппетиты!

В середине 60-х годов в Сморгонском районе насчитывалось около 140 школ и дошкольных учреждений, штат районного отдела народного образования вместе с заведующим, инспекторами, методическим кабинетом, бухгалтерией и техническим работником составлял 10 человек. В середине 90-х отдел народного образования переименовали в управление образования Сморгонского райисполкома. И сразу же у начальника управления появляются два заместителя, а штат разрастается до 88 человек, хотя количество школ сократилось до 34-х.

Безработица среди молодежи высока. Профессионально-технические училища готовят специалистов на оборудовании, выпущенном 50—70 лет тому назад. Посмотрите учебно-материальную базу Сморгонского ПТУ-128, местного УПК, проанализируйте потребность, возможность получить качественную профессиональную подготовку и трудоустройство этих выпускников и посчитайте, какие суммы уходят на никому не нужное обучение. Не лучше ли сократить на три четверти аппарат управления образования и его структур, лишних заместителей директоров школ и социальных педагогов, предоставить хоть сносное финансирование школам, ПТУ-128?

Господа-чиновники, умерьте свои аппетиты, вы слишком жируете! Я считаю, что необходимо изучить опыт управленческих структур в странах Западной Европы, и, вместо беззастенчивого и постоянного грабежа нищего народа, сотни миллионов сэкономленных рублей могут быть направлены в производственную и социальную сферы. Пользы будет больше.

Тадеуш КАРТАВИК.

г. Сморгонь.

«Славянскі базар у Віцебску» пакуль без грошай

Фінансаванне мерапрыемстваў па падрыхтоўцы XII міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" пакуль не праводзіцца. Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі 28 мая кіраўнік дырэкцыі фестывалю Радзівон Бас. Начальнік упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, член аргкамітэта фестывалю Мікалай Пашынскі паведаміў, што сёлета ў "Славянскага базару" будуць "традыцыйныя крыніцы фінансавання". З бюджэту Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі плануецца выдзеліць 24,8 млн. расійскіх рублёў, прычым беларуская доля будзе большай — яна складзе 15,5 млн. расійскіх рублёў.

Каменціруючы змяншэнне фінансавага ўдзелу Расіі ў падрыхтоўцы фестывалю, Радзівон Бас заявіў: гэта звязана з "пазіцыяй некаторых чыноўнікаў з Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы і Міністэрства культуры Расіі".

Сяргей КОЧАТАЎ, БелаПАН.

У Кіеве пройдуць Дні Мінска

Дні Мінска пройдуць у Кіеве 3—4 чэрвеня з удзелам шматлікай дэлегацыі прадстаўнікоў дзелавых колаў і дзеячаў культуры з беларускай сталіцы.

У рамках мерапрыемства запланаваны семінар, прысвечаны перспектывам развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, перамовы паміж прадстаўнікамі прадпрыемстваў Мінска і Кіева, а таксама вялікая культурная праграма.

Кіяўлянам будуць прадстаўлены спектакль "Поле бітвы" Тэатра-студыі кінаакцёра, кінафільм "Павадыр", фотавыстава "Мінск сёння". З канцэртамі перад жыхарамі і гасцямі ўкраінскай сталіцы выступяць дзяржаўны народны аркестр і ансамбль танца, папулярныя ансамблі "Сябры" і "Бяседа", Аляксандр Ціхановіч, Ядзвіга Паплаўская, Аляксандр Саладуха, Кірыл Слука і іншыя вядомыя беларускія выканаўцы.

Ірына САЗАНОВІЧ.

Зона напрасных ожиданий

Год назад А.Лукашенко подписал указ о создании свободной экономической зоны "Гродноинвест". Руководству Гродненской области СЭЗ видится своеобразным инвестиционным мотором, который будет тянуть за собой всю экономику области. Однако пока этим надеждам не суждено было сбыться.

СЭЗ "Гродноинвест" с самого начала была в трудной ситуации. Первая свободная экономическая зона появилась в Бресте в 1996 году. С этого момента в Беларуси начался настоящий бум. Свободные экономические зоны появились в Минске, Витебске и Гомеле. Все это время руководство Гродненской области прилагало максимум усилий к регистрации СЭЗ в Гродно. Однако положительного решения удалось добиться только в прошлом году. Нежелание минских чиновников регистрировать СЭЗ в Гродно объясняют по-разному. "Западные территории у нас традиционно зажимают, хотят сделать сельскохозяйственным придатком", — считает Франц Мамуль, председатель Центра поддержки предпринимательства. Так или иначе, за время, которое прошло с 1996 года, те, кто был заинтересован свободными экономическими зонами, стали разворачивать свой бизнес на территории других СЭЗ. Однако несмотря на сложные стартовые условия администрация "Гродноинвеста" не теряет оптимизма.

На сегодняшний день резидентами СЭЗ "Гродноинвест" являются только 6 предприятий. Резиденты планируют заняться производством кондитерских изделий, соков, детских и женских чулочно-носочных изделий, грузовых амортизаторов.

"Для гродненцев СЭЗ — это в первую очередь создание новых рабочих мест", — считает Александр Полищук, начальник отдела инвестиций и внешнеэкономической деятельности СЭЗ "Гродноинвест". Однако на сегодняшний день создано всего лишь 16 рабочих мест. "Это только начало... Интерес к свободным зонам со стороны предпринимателей очень большой. Уже заявлено инвестиций на сумму свыше 2,3 млн. долларов США", — говорит Александр Полищук. Но пока местный бюджет не получил ни копейки от резидентов СЭЗ "Гродноинвест". "Инвестиции это инвестиции, а поступления в местный бюджет пойдут тогда, когда предприятия начнут работать, получать прибыль", — поясняет Анатолий Якинчук, начальник управления методологии налогообложения юридических лиц Гродненской областной налоговой инспекции.

Географическая близость Польши и удобное расположение СЭЗ, казалось бы, должны в первую очередь привлекать польских бизнесменов. Однако прорыва на этом направлении нет. "Пока заинтересованность гродненской СЭЗ со стороны польских бизнесменов невелика. Прежде всего потому, что условия в СЭЗ "Гродноинвест" хуже, чем в других свободных зонах Беларуси. Кроме того, немногие хотят рисковать, вкладывая деньги и не зная в конечном счете, что из этого получится", — говорит Зигмунд Пелуць, директор Полонийного центра бизнеса и туризма, занимающегося развитием контактов с польскими бизнесменами. Те же, кто потенциально заинтересован инвестициями в СЭЗ, жалуются на отсутствие полной и достоверной информации об условиях, предлагаемых СЭЗ "Гродноинвест". "Тут есть недоработка государственных органов. Не создан перечень инвестиционных предложений, нет хорошего интернет-сайта... Чтобы изменить ситуацию, нужно создать базу данных, и она должна быть доступна для потенциальных инвесторов", — считает Франц Мамуль, председатель Центра поддержки предпринимательства. Безусловно, панацеей от всех экономических бед Гродненщины "Гродноинвест" не станет. Главными целями создания СЭЗ являлись наращивание экспортного потенциала области, освоение выпуска продукции импортозамещения, создание производств, ориентированных на выпуск продукции из местного сырья. Однако на сегодняшний день доля всех свободных экономических зон в объеме промышленного производства страны составляет менее 2 процентов. Специальный правовой режим СЭЗ не распространяется на торговую и торгово-закупочную деятельность. Это существенно сужает возможности привлечения иностранных инвесторов. Поэтому амбициозные планы руководства области по превращению Гродно в инвестиционный Клондайк скорее всего так и останутся на бумаге.

Андрей ОДЛЯНИЦКИЙ.

Фото IREX/ProMedia.



Фишка Путина,

или Беларусь попала в «зону»

Владимир Путин в послании к Федеральному собранию "замолчал" белорусский вопрос. Вместо этого он решил объять все пространство СНГ. "Мы рассматриваем пространство СНГ как сферу наших стратегических интересов. Мы также исходим из того, что и для государств Содружества Россия является зоной их национальных интересов. При этом наша страна заинтересована в стабильности и экономическом прогрессе на пространстве СНГ", — эту фразу российского лидера можно считать началом новой политики Москвы в сфере постсоветской интеграции.

Эта политика уже достаточно успешно проводится в жизнь. Создана группа по формированию единого экономического пространства, конечной целью работы является создание Организации региональной интеграции. Идея вышла из Кремля и, как полагают некоторые политологи, сразу не понравилась Александру Лукашенко. На днях президент Беларуси на встрече с членами рабочей группы по созданию ЕЭП говорил, что в позициях Беларуси, России, Казахстана и Украины по вопросам формирования единого экономического пространства "есть принципиальные расхождения". Настолько принципиальные, что Беларусь, в случае чего, согласится "отойти и не мешать".

Итак, несомненно одно: Беларусь перестает быть лидером в интеграционных процессах на постсоветском пространстве. Владимир Путин обгоняет Александра Лукашенко в роли "собирателя земель ". Согласно же новой концепции российского руководства, артикулированной в послании Путина, Беларусь четко попадает в российскую зону влияния. Только согласится ли с этим остальной мир?

Политолог **Валерий Карбалевич** считает, что Россия действительно всерьез пересматривает свои отношения с Беларусью и другими странами СНГ.

— То, что в послании президента России ни слова не было сказано о Беларуси, — это симптом. Я думаю, что в Москве происходит переоценка роли Беларуси во внешней политике России. Во время прошлогоднего конфликта руководителей двух стран российская политическая элита убедилась, что Лукашенко не хочет реальной интеграции. Поэтому предпринята попытка реализовать идею Путина — создать Организацию региональной интеграции и втянуть в эти процессы Украину. Украина для России сейчас значит если не больше, то и не меньше, чем Беларусь.

Россия вступает в двухэтапную предвыборную кампанию, а поэтому пока не будет делать никаких резких движений в отношении Беларуси. Эта позиция сохранится до российских президентских выборов. Это касается и акционирования "Белтрансгаза", и подписания Конституционного акта — как мы знаем, встреча президентов задерживается.

Что касается зоны влияния России, вряд ли с этим согласится Запад. Разумеется, некоторые кулуарные договоренности о зонах влияния есть. Но полностью отдавать СНГ на откуп России, например, США не собираются. Сейчас идет рассмотрение "Акта о демократии в Беларуси", который предусматривает достаточно жесткое давление на официальный Минск. Во время операции против талибов на территории некоторых стран СНГ появились военные базы США... Разумеется, Запад согласен на то, чтобы Россия играла в своем регионе определенную стабилизирующую роль. Но любые попытки Москвы возродить империю будут жестко пресекаться.

Лидер Объединенной гражданской партии **Анатолий Лебедько** предполагает, что "собирание земель", инициированное Владимиром Путиным, усилит позицию России в мире. Но по отношению к Беларуси результативен только консолидированный подход:

— До президентских выборов в России белорусская тема не является приоритетом. Она станет таковой только после выборов. Путину сейчас выгодно позиционировать себя не только как интегратора с Беларусью, но и как интегратора всего постсоветского пространства. Для этого и была создана "четверка" — костяк Организации региональной интеграции — из России, Беларуси, Украины и Казахстана. Симпатии к российскому президенту будут подпитываться не только интеграцией с Беларусью, но и улучшением отношений с Украиной. В этом "фишка" администрации Путина. России надо укрепиться как влиятельному региональному государству. Это усилит позицию Путина как лидера на постсоветском пространстве. И тогда уже можно будет думать о партнерстве на равных с Европой и США.

